Выступленне вучня ў ролі В. Урублеўскага

Я захапляўся Кастусём. Сілай яго духу, непрыманнем фальшу, ілжы, крывадушнасці, найвышэйшым пачуццём справядлівасці, бескарыслівасцю. Сяброўства стала адным з самых моцных маіх уражанняў, каштоўных набыткаў у багатых падзеях жыцця. Мы, тады яшчэ зусім маладыя, узялі на свае плечы вялікую ношу – клопат пра лёс радзімы, пра лёс пакрыўджанага люду. І неслі яе сумленна і горда. Удзельнічаў я і ў выпуску «Мужыцкай праўды».

Зімою 1863 года ў розных кутках Беларусі ўжо дзейнічалі паўстанцкія атрады. Аснову іх складалі моладзь, беззямельная шляхта, сяляне, рамеснікі, разначынцы. У сакавіку рэвалюцыйным рухам была ахоплена ўся тэрыторыя Беларусі. Паўстаннем на Беларусі і Жмудзі кіраваў Літоўскі правінцыяльны камітэт. Ягоныя структурныя ячэйкі і арганізацыі дзейнічалі ў Брэсце, Слоніме, Ваўкавыску, Пружанах, Кобрыне. У паўстанні брала ўдзел ад 68 да 77 тысяч чалавек. Найбольш шырокага размаху рэвалюцыйны рух дасягнуў у Гродзенскай губерні. Тут паўстаннем кіравалі К. Каліноўскі і я. Баявым клічам паўстанцаў стаў крылаты лозунг «За зямлю і волю!».

Памятны бой адбыўся 31 снежня 1863 года. Мы стаялі ў сядзібе Малая Бакоўка. На золку наляцелі драгуны. Сутычка была жорсткай. Наша конніца загінула. Я з рэшткамі паўстанцаў перамяшчаўся па Любліншчыне. Але гэта былі ўжо апошнія іскры пажару.